

# ПЫТАННІ МІЖНАРОДНАГА ПАРАДКУ

**Учора Прэзідэнт Беларусі сустрэўся з кіраўніком Следчага камітэта Расіі і паслом Венесуэлы**

(Стар. 2–3)


РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 СНЕЖНЯ 2025 г. ПЯТНІЦА № 240 (30628)




Фота з архіва БелТА.

Гэтыя любімыя многімі ўжо традыцыйныя для нашай краіны мерапрыемствы праводзяцца па ініцыятыве Прэзідэнта Беларусі. Пасыл кіраўніка дзяржавы аб тым, што ў чароўныя дні навагодніх і калядных свят трэба падзяліцца цяплом і ўвагай з тымі, каму іх не стае, знайшоў шчыры водгук у сэрцах беларусаў, і сёння гэтыя акцыі можна назваць сапраўды народнымі.

СТАР. 4–5

## ЭСТАФЕТА ДАБРА

**Праз некалькі дзён стартуюць навагоднія дабрачынныя акцыі «Нашы дзеці» і «Ад усёй душы»**



СВАЁ – ДУШЭЎНАЕ, ЦЁПЛАЕ 10



ПРЫНЦ З ІНТЭРНЭТУ ЦІ МАХЛЯР? 15



+TV ПРАГРАМА

«ДАРАГІ МОЙ ЧАЛАВЕК»

ПЯЦІГОДКА ЯКАСЦІ

## РАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ПАКУПКІ

**Якія спажывецкія стэрэатыпы аб якасці прадуктаў — не больш чым міф**

Ці праўда, што ДАСТ — гарант ідэальнай якасці, у сучасным марожаным мала засталося натуральнага, а высокая цана тавару — абавязковы паказчык яго выдатных уласцівасцяў? Разбіраем некаторыя з устойлівых стэрэатыпных спажывецкіх перакананняў разам са спецыялістамі Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі.

СТАР. 8



Фота БелТА.


Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале **@zviazdaby.** Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!





Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2026 года

**Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.**

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2026 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.




ISSN 1990 — 763X

# «МЫ З ВАМІ ПРЫТРЫМЛІВАЕМСЯ АДНОЙ ЛІНІІ,

## Прэзідэнт правёў сустрэчу са старшынёй Следчага камітэта Расіі

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што візіт Аляксандра Бастрыкіна ў Беларусь заўсёды расцэньвае як вельмі важны. Па словах кіраўніка дзяржавы, сустрэча ў Палацы Незалежнасці з'яўляецца не толькі жэстам ветлівасці: беларускаму лідару і кіраўніку Следчага камітэта Расіі заўжды ёсць аб чым пагаварыць, абмеркаваць пытанні двухбаковага ўзаемадзеяння.



«Мы з вамі прытрымліваемся адной лініі, адной пазіцыі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

**— У нас ніколі не было разыходжанняў пры ацэнцы і ўнутраных, і знешніх фактараў існавання Расіі, Беларусі. Таму для мяне вельмі важна, што вы хоць на некалькі хвілін, але заглянеце да мяне, і мы зможам зверыць гадзіннікі. Для мяне, падкрэсліваю, гэта вельмі важна».**

Прэзідэнт заўважыў, што Аляксандр Бастрыкін з'яўляецца сябрам не толькі для яго, але і для ўсяго беларускага народа. «Сачу ўважліва, наколькі гэта магчыма, за вашай работай, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

**— Вельмі рады, што ў складаныя, цяжкія часы, вам усё-такі**

ІНТЭГРАЦЫЯ

# НА ЭКАНАМІЧНЫМ ШЛЯХУ ЕАЭС

## Пасяджэнне Еўразійскага міжурадавага савета прайшло ўчора ў Маскве пад старшынствам Прэм'ер-міністра Беларусі Аляксандра Турчына

У пасяджэнні ўдзельнічалі кіраўнікі ўрадаў пяці дзяржаў Еўразійскага эканамічнага саюза. Пасяджэнне Еўразійскага міжурадавага савета — завяршальнае ў бягучым годзе. Традыцыйна былі разгледжаны найбольш важныя пытанні, перш за ўсё звераны гадзіннікі па ходзе выканання зацверджанай кіраўнікамі дзяржаў — удзельніц ЕАЭС дэкларацыі аб далейшым развіцці эканамічных працэсаў у рамках Еўразійскага эканамічнага саюза да 2030 года і на перыяд да 2045 года «Еўразійскі эканамічны шлях».

### ВАЖНЫ РУБІКОН РАЗВІЦЦЯ ПРОЙДЗЕНЫ

У Еўразійскім эканамічным саюзе створаны трывалы інтэграцыйны фундамент для пераходу да новага этапу супрацоўніцтва «пяцёркі», заявіў Прэм'ер-міністр Беларусі. «Гэты год стаў фінальным для рэалізацыі стратэгічных кірункаў развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі да 2025 года, выкананне якіх дало магчымасць стварыць трывалы інтэграцыйны фундамент для пераходу да новага этапу еўразійскага супрацоўніцтва, заснаванага на прынцыпах дэкларацыі «Еўразійскі эканамічны шлях». Лічу гэта важным рубіконам развіцця еўразійскай інтэграцыі, які дазваляе нам з упэўненасцю глядзець у найбліжэйшую будучыню Еўразійскага эканамічнага саюза», — сказаў Аляксандр Турчын.

Беларусь у 2025 годзе старшынствавала ў органах ЕАЭС. «У цэнтры нашай увагі пастаянна знаходзілася тэматыка ўстаранення бар'ераў і скарачэння выключэнняў і абмежаванняў ва ўзаемным гандлі. На пляцоўцы Еўразійскай эканамічнай камісіі на працягу года разгледжана больш як 30 праблемных пытанняў, па пяці знойдзены рашэнні, па васьмі дзяржавамі-членамі вядзецца работа па прыняцці прававых актаў для ўстаранення. Разам з тым пытанні па гэтым трэку яшчэ далёка не зняты. Сістэмныя намаганні на забеспячэнні на еўразійскай прасторы чатырох свабод трэба прадоўжыць», — перакананы кіраўнік урада Беларусі.

Паводле яго слоў, краінам ЕАЭС удалося дасягнуць практычных вынікаў у частцы мытнага адміністравання пры імпарце падаткаёмістых тавараў у мэтах мінімізацыі фіскальных рызык і страт бюджэтаў дзяржаў — членаў саюза. «Дадатковае паступленне ў бюджэты краін у выніку гэтай работы складае каля 75 млн долараў па ўвазной мытнай пошліне і больш як 600 млн долараў па падатку на дабаўленую вартасць, — прывёў аргументы Аляксандр Турчын. — Лічу, што сістэмнае ўзаемадзеянне па ўніфікацыі вартасных індыкатараў рызыкі адносна падаткаёмістых тавараў павінна быць прадоўжана». У пазітыўным плане ён таксама адзначыў кансультацыі па ўкараненні ўзаемнага прызнання электроннага лічбавага подпісу для мэт дзяржзакупак, прыняцце арганізацыйных мер для бесперашкоднай работы механізма прызнання банкаўскіх гарантый.

«Па больш як 100 таварных пазіцыях, у тым ліку такіх адчувальных, як медыцынскія вырабы і лекі, краіны ўзгаднілі ўмовы прызнання тавараў еўразійскімі для мэт дзяржзакупак. Сёлета Еўразійскі рэестр прамысловых тавараў павялічыўся на 50 % ад усяго перыяду свайго існавання з 2020 года і пачаў актыўна выкарыстоўвацца для мэт пацвярджэння краіны паходжання тавараў і для пошуку партнёраў для кааперацыі з ЕАЭС», — дадаў Прэм'ер-міністр.

### ЗНАЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ КААПЕРАЦЫІ

Аляксандр Турчын канстатаваў стварэнне добрых перадумоў для фарміравання ўстойлівых кааперацыйных сувязяў у саюзе. «Абноўленае палажэнне аб міждзяржаўных праграмах змяшчае значны патэнцыял стымулявання прамысловага супрацоўніцтва на прасторы ЕАЭС. Еўразійская эканамічная камісія ў рамках прапрацоўкі беларускай ініцыятывы аб сумеснай праграме імпартазамяшчэння падрыхтавала цэлую серыю аглядаў па магчымай кааперацыі ў прамысловасці. Прывяду адну лічбу: пералік замежных вузлоў і агрэгатаў, якія выкарыстоўваюцца толькі расійскімі прадпрыемствамі, складае 6 тысяч пазіцый. А калі паглядзець у кожнай дзяржаве — гэта бязмежныя магчымасці нашага кааперацыйнага супрацоўніцтва», — звярнуў увагу Аляксандр Турчын.

«Разлічваем, што з больш высокай эфектыўнасцю ў наступным годзе пачне працаваць механізм фінансавага садзейнічання сумесным праектам у сферы АПК, за кошт чаго будзе паглыбляцца супрацоўніцтва ў інавацыйнай сферы і ў галіне развіцця аграгэхналогій. Неабходна забяспечыць актыўную работу па фарміраванні нарматыўнай асновы, каб без затрымак перайсці да практычных крокаў на гэтым кірунку кааперацыйнага ўзаемадзеяння. Патрабуецца агульнае павышэнне дынамікі разгляду на пляцоўцы камісіі пытанняў гарантавання харчовай бяспекі ў ЕАЭС. Гэта тэма вельмі важная і адчувальная для эканомік усіх краін аб'яднання», — працягнуў Прэм'ер-міністр.

# АДНОЙ ПАЗІЦЫІ»

**...неяк удаецца ўтрымліваць сваю сістэму, структуру і працаваць на карысць не толькі Расіі, а і нашага Саюзу, які мы імкнёмся пабудаваць».**

Старшыня Следчага камітэта Расійскай Федэрацыі, у сваю чаргу, выказаў удзячнасць беларускаму лідару за магчымасць сустрэчы, звярнуўшы ўвагу, што для Прэзідэнта пераднавагодні дні традыцыйна напружаныя.

Ён праінфармаваў кіраўніка дзяржавы, што перад сустрэчай у Палацы Незалежнасці выступіў на сур'ёзным мерапрыемстве — на III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прымеркаванай да прыняцця Канвенцыі ААН аб папярэджанні генацыду і пакарання за яго.

Аляксандр Бастрыкін расказаў аб планах пасля сустрэчы з Прэзідэнтам прыняць удзел у рабочай сустрэчы з калегамі са Следчага камітэта Беларусі. «Падвядзём вынікі сумеснай работы за 2025 год і намецім перспектывы работы на 2026-ы, — праінфармаваў ён Аляксандра Лукашэнку. — Каб нам узаемадзейнічаць, дасягаць вынікаў у ходзе сумеснай работы па асноўных стратэгічных кірунках нашага супрацоўніцтва».

## Даслоўна

### «МЫ ДЗЕЙНІЧАЕМ ЯК АДЗІНАЕ ЦЭЛАЕ, ЯК АДЗІНАЯ ДЗЯРЖАВА»

У размове з журналістамі **старшыня Следчага камітэта Расіі Аляксандр Бастрыкін** падзяліўся падрабязнасцямі сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі. Паводле яго слоў, гэтым разам падчас сустрэчы расійскі бок праінфармаваў кіраўніка беларускай дзяржавы аб выніках работы са Следчым камітэтам Беларусі, а таксама аб некаторых перспектывах на 2026 год.

Аляксандр Бастрыкін адзначыў, што галоўная перспектыва ўзаемадзеяння следчых органаў Беларусі і Расіі на 2026 год — сумесная работа, у тым ліку з калегамі з Генеральнай пракуратуры, па расследаванні генацыду савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.



«Многія лічбы аб генацыдзе Савецкага Саюза, якія мы ведалі, павялічыліся ў шмат разоў, — канстатаваў ён. — Да нядаўняга часу мы лічылі, што ў блакадным Ленінградзе загінула 800 тысяч чалавек. Цяпер мы выйшлі на 1 мільён 250 тысяч — толькі ў адным Ленінградзе. Горад не здаўся, але панёс вялікія страты... Мы даведваемся пра новыя невядомыя пахаванні, выкарыстоўваем архіўныя матэрыялы, якія даюць Генеральная пракуратура і Следчы камітэт Беларусі».

Старшыня Следчага камітэта Расіі таксама адзначыў узаемадзеянне праваахоўных органаў на беларуска-расійскай граніцы. «Ёсць сітуацыі, калі нашы злачынцы перабягаюць у Беларусь, а потым спрабуюць з'ехаць у Еўропу, — удакладніў ён. — У гэтай сферы мы таксама вельмі цесна ўзаемадзейнічаем. Але самае галоўнае, і Аляксандр Рыгоравіч гэта ацаніў, — у нас вельмі блізкія, чалавечыя і сяброўскія адносіны, бо мы Саюзная дзяржава. Гэта не фармальны падыход, калі «паперку скінулі, забыліся і нічога не зрабілі». Мы дзейнічаем па-сапраўднаму, як адзінае цэлае, як адзіная дзяржава. І гэта вельмі прыемна».

Аляксандр Бастрыкін пракаментаваў і супрацоўніцтва з усходнімі і заходнімі краінамі па лініі праваахоўнай і следчай дзейнасці. Паводле яго слоў, з заходнімі краінамі ўзаемадзеянне ў гэтай сферы амаль адсутнічае. «Раней у нас было вельмі шмат — да 30 пагадненняў, у тым ліку з еўрапейскімі дзяржавамі. Мы наўпрост узаемадзейнічалі з Інтэрполам. З Еўропай пакуль кантакт наладзіць не ўдаецца. Многія нашы ранейшыя сувязі з праваахоўнымі органамі Францыі, Германіі, Італіі цяпер перапынены», — праінфармаваў старшыня Следчага камітэта Расіі. У той жа час ён адзначыў добрае ўзаемадзеянне ў дадзеным ключы з Паўночнай Афрыкай, КНР і Індыяй.

**Вераніка КАНЮТА, Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота БелТА.**

## «КАБ МЫ МАГЛІ ПРЫНЯЦЬ АДПАВЕДНЫЯ РАШЭННІ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў НАШАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ»

### Аб чым Аляксандр Лукашэнка гаварыў з паслом Венесуэлы

По запрашэнні беларускага лідара Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла ў Расійскай Федэрацыі Хесус Рафаэль Саласар Веласкес 25 лістапада наведаў Палац Незалежнасці. Падчас папярэдняй сустрэчы кіраўнік дзяржавы выказаў надзею на больш інтэнсіўныя ўзаемаадносіны паміж краінамі і падкрэсліў, што Беларусь супрацоўнічае з Венесуэлай вельмі даўно. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка запрасіў свайго венесуэльскага калегу наведаць нашу краіну, не выключыў Прэзідэнт і свайго візіту ў Баліварыянскую Рэспубліку.

«Спадар пасол, зусім нядаўна мы з вамі абмяркоўвалі шэраг праблем у нашых узаемаадносінах, сітуацыі вакол Венесуэлы, — нагадаў кіраўнік дзяржавы. — Тады дамовіліся аб тым, што вы павінны ўзгадніць некаторыя пытанні з кіраўніцтвам Венесуэлы, з Нікаласам Мадура. Мы дамовіліся аб тым, што пасля ўзгаднення некаторых праблем, пытанняў вы знойдзеце час для таго, каб прыехаць да мяне, яшчэ раз сустрэцца, каб мы ўжо маглі прыняць адпаведныя рашэнні, якія знаходзяцца ў нашай кампетэнцыі. А калі патрэбна, потым мы падключым і Прэзідэнта Венесуэлы».

**Вераніка КАНЮТА.**




Фота БелТА.

гандлёвае пагадненне з Манголіяй. З мая 2025 года запрацавала паўнафарматнае пагадненне аб свабодным гандлі з Іранам. У бліжэйшы час плануецца падпісанне яшчэ аднаго пагаднення аб свабодным гандлі — з Інданезіяй. Тры дзяржавы — М'янма, Нікарагуа і Венесуэла — падалі свае заяўкі на атрыманне статусу дзяржавы-назіральніка пры ЕАЭС», — сказаў Аляксандр Турчын.

«Цяпер перад саюзам стаіць задача па фарміраванні пераліку новых партнёраў ЕАЭС. Думаю, у гэтай рабоце трэба зрабіць акцэнт на дружалюбных дзяржавах Азіі і Афрыкі, у рынках якіх зацікаўлены вытворцы нашых краін», — дадаў Прэм'ер-міністр Беларусі.

«Мною пералічаны ключавыя рашэнні, якія былі прыняты ў адыходзячым годзе. У той жа час у парадку дня еўразійскай інтэграцыі па-ранейшаму застаецца шэраг не менш важных задач, па якіх яшчэ трэба выйсці на ўзгодненае рашэнне», — акцэнтаваў Прэм'ер-міністр Беларусі.

«Завяршаецца год беларускага старшынства ў органах ЕАЭС. Яго вынікі агучыць Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка на снежаньскім пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага савета», — сказаў на заканчэнне Аляксандр Турчын.

Сур'ёзная ўвага ўдзелена абароне агульнага рынку ад небяспечнай прадукцыі. Прыняты шэраг важных дакументаў, якія ўтвараюць сістэму ўзаемадзеяння наглядных органаў, мытных органаў і органаў па акрэдытацыі. Неабходна наладзіць работу гэтай міжкраінавай сістэмы, каб барацьба з неабгрунтавана выдадзенымі дакументамі аб ацэнцы адпаведнасці была сапраўды эфектыўнай на рынку ўсяго ЕАЭС», — заклікаў Аляксандр Турчын.

## ЁСЦЬ КУДЫ ІМКНУЦЦА

Прэм'ер-міністр Беларусі таксама адзначыў праведзеную работу па фарміраванні агульнага фінансавага рынку ЕАЭС. «Прыняты шэраг дакументаў, накіраваных на забеспячэнне свабоды аперацый з каштоўнымі паперамі, умацаванне гандлёвага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва, абарону правоў і законных інтарэсаў спажыўцоў фінансавых паслуг. Цяпер галоўнае, каб усе зафіксаваныя дамоўленасці былі рэалізаваны ў поўнай меры. Кожны з гэтых дакументаў прымаўся з задзелам на будучыню і з разлікам на адчувальны эканамічны эфект. Працэс гарманізацыі ў фінансавай сферы неабходна ажыццяўляць на пастаяннай аснове, зыходзячы з дынамікі развіцця нацыянальных заканадаўстваў, міжнародных стандартаў і такой дадзенасці, як лічбавыя фінансавыя активы, валюты і плацежныя сістэмы», — перакананы Прэм'ер-міністр.

На яго думку, значны рэзерв для пабудовы ўстойлівых эканамічных сувязей у рамках ЕАЭС ёсць на рынку паслуг. «У гэтым кантэксце хацеў бы звярнуць увагу на канцэпцыю развіцця турызму ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза і важнасць развіцця сферы гасціннасці і фарміравання адпаведнай інфраструктуры. Гэта сфера эканомікі здольна зрабіць істотны ўнёсак у рост ВУП дзяржаў-членаў, у вырашэнне пытанняў занятасці насельніцтва, падтрымкі рамёстваў і захавання культурнага кода нашых народаў», — растлумачыў Аляксандр Турчын.

«Асаблівую ўвагу заслугоўвае наша прасоўванне на знешнім контуры. Падпісаны пагадненні аб эканамічным партнёрстве з Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі і часовае

* * *

У сваю чаргу яго расійскі калега Міхаіл Мішусцін адзначыў: «Год, які мінае, праводзім з годным папярэднім вынікам па ключавых паказчыках, такіх як валавы ўнутраны прадукт саюза, прамысловая вытворчасць, сельская гаспадарка, будаўніцтва, абарот рознічнага гандлю. Асобна адзначу істотны рост прадпрымальніцкай актыўнасці ў нашых краінах. Інвестыцыі ў асноўны капітал у цэлым па Еўразійскім эканамічным саюзе ў першым паўгоддзі прыбавілі звыш 6 працэнтаў. Мы падтрымліваем імкненне дзелавых колаў працаваць разам, перш за ўсё калі размова ідзе аб запуску высокатэхналагічных прадпрыемстваў».

Таксама расійскі прэм'ер, звяртаючыся да Аляксандра Турчына, падзякаваў беларускі бок за актыўнае старшынства нашай краіны ў ЕАЭС ў бягучым годзе. Актыўнае прасоўванне Беларуссю інтэграцыйнай павесткі ў год старшынства адзначылі таксама прэм'ер-міністры іншых краін еўразійскай «пяцёркі».

**Паводле БелТА.**

# ЭСТАФЕТА ДАБРА

## ЧУЖЫХ ДЗЯЦЕЙ НЕ БЫВАЕ

Рэспубліканская акцыя «Нашы дзеці» ахопіць сёлета больш за мільён дзяцей з усёй краіны. Пра гэта расказаў **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай, выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Віктар ДОЎНАР.** Яна пройдзе ў Беларусі з 15 снежня 2025 года да 14 студзеня 2026 года. Вышэйшымі службовымі асобамі дзяржавы, кіраўнікамі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, дзяржаўных і іншых арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў, удзельнікамі грамадзянскай супольнасці запланавана наведванне больш за 150 установ, сярод якіх дзіцячыя інтэрнатныя ўстановы, арганізацыі аховы здароўя, цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, установы адукацыі, дзіцячыя дамы сямейнага тыпу.

«Старт акцыі «Нашы дзеці» будзе праходзіць у Гомелі, галоўнай пляцоўкай краіны стане Гомельскі палацава-паркавы ансамбль. Адкрыццё пройдзе ў выглядзе тэлемоста з усімі абласцямі нашай краіны. На сувязі з Гомелем будуць усе рэгіянальныя лакацыі, дзе прывітаюць удзельнікаў гэтай акцыі вышэйшыя службовыя асобы аблвыканкамаў, прадставяць творчыя нумары. Далей акцыя пойдзе па ўсёй краіне», — расказаў Віктар Доўнар.







По традыцыі ў рамках акцыі будзе дадзена дабрачыннае мерапрыемства ад імя кіраўніка дзяржавы ў Палацы Рэспублікі. На галоўную ёлку краіны запрошаны 2370 дзяцей з усіх рэгіёнаў Беларусі. Гэта дзеці ад 8 да 14 гадоў з сацыяльна неабароненых катэгорый — хлопцы і дзяўчаты, якія знаходзяцца пад апекай, страцілі сваіх бацькоў. Будуць і дзеці, якія дасягнулі высокіх вынікаў у вучобе, спорце, культурнай дзейнасці. Таксама па традыцыі ўдзел у гэтым мерапрыемстве возьмуць дзеці з Расіі.

Акрамя таго, больш за 330 найлепшых навучэнцаў краіны трапяць на навагодні баль у Палацы Незалежнасці. Сярод іх студэнты ВНУ, навучэнцы каледжаў, школ і кадэцкіх вучылішчаў.

Традыцыйна мерапрыемствы акцыі пройдуць не толькі на рэспубліканскім узроўні. У кожным абласным цэнтры запланаваны навагодняя мерапрыемствы для дзяцей. Пройдуць балі, адбудуцца віншаванні дзяцей у інтэрнатных установах. Напрыклад, у Мінскай вобласці старт акцыі дасць арт-фестываль «Запальваем зоркі». У ім паўдзельнічаюць навучэнцы ўстаноў дашкольнай, агульнай сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай і дадатковай адукацыі. Спаборнічаць будуць у розных намінацыях, сярод якіх «Вакал», «Выкананне на музычных інструментах», «Харэаграфія», «Літаратурная творчасць», — праінфармаваў прадстаўнік Міністэрства адукацыі.

Такія мерапрыемствы будуць праходзіць у кожнай вобласці. «Як неаднаразова падкрэсліваў кіраўнік нашай дзяржавы, самая галоўная мэта акцыі — падарыць свята кожнаму дзіцяці, бо чужых дзяцей у нас няма. Таму акцыя так і называецца — «Нашы дзеці». Перакананы, што кожны неабыякавы грамадзянін краіны зможа ўзяць пасільны ўдзел у віншаванні нашых дзяцей», — дадаў Віктар Доўнар.

## З ПАВАГАЙ ДА СТАРЭЙШЫХ

З 23 снежня да 14 студзеня 2026 года ўключна ў краіне пройдзе рэспубліканская навагодняя дабрачынная акцыя для пажылых людзей «Ад усёй душы». Пра гэта журналістам паведаміла **намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльнай падтрымкі, апекі і папячыцельства Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Галіна ЛАЗАРЭНКА.**

У перыяд правядзення акцыі пад пільнай увагай застаюцца ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, іх у краіне на кастрычнік пражывала 698 чалавек, таксама тыя, хто пацярпеў ад наступстваў вайны, іх амаль 5,7 тысячы чалавек, таксама больш за

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

ПЯЦІГОДКА РАЗВІЦЦЯ

# ЗБАЛАНСАВАНА ФУНКЦЫЯНУЮЦЬ УСЕ КЛЮЧАВЫЯ СЕКТАРЫ



**З якімі вынікамі завяршае пяцігодку Гомельшчына**



За эканамічнымі паказчыкамі, вядома, — якасць жыцця людзей, развіццё гарадоў і сельскай мясцовасці, работа сістэм аховы здароўя, адукацыі, культуры і, што не менш важна, удасканаленне механізмаў кіравання... Пра пункты росту эканомікі Гомельскай вобласці і вынікі, з якімі рэгіён завяршае пяцігодку, — размова з членам Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, дэлегатам УНС, намеснікам старшыні Гомельскага аблвыканкама Ксеніяй ПАНЦЮХОВАЙ.

***— Ксенія Аляксандраўна, Гомельшчына апошнія гады ўпэўнена ўтрымлівае заўважныя пазіцыі ў структуры рэспубліканскіх эканамічных паказчыкаў. У чым, на ваш погляд, галоўны вынік сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна за 2021—2025 гады і якія змены можна назваць сапраўды знакавымі?***

— Галоўны вынік — ва ўстойлівым росце эканомікі і ўмацаванні ролі Гомельскага рэгіёна ў агульнанацыянальнай сістэме. Сёння на Гомельшчыну прыпадае каля 20 % усёй прамысловай вытворчасці краіны і больш за 10 % сельскагаспадарчай вытворчасці, знешняга і ўнутранага гандлю, а таксама інвестыцый у асноўны капітал. За перыяд з 2021 года прырост валавога рэгіянальнага прадукту склаў 3,5 %. Гэта сведчыць пра тое, што рэгіён здолеў сфарміраваць стабільную мадэль развіцця і забяспечыць збалансаванае функцыянаванне ўсіх ключавых сектараў. Прамысловая база прыкметна ўзмацнілася, пашырылася наменклатура прадукцыі, адчувальна вырасла інвестыцыйная актыўнасць, палепшылася якасць жыцця жыхароў вобласці.

***— Прамысловы комплекс застаецца стрыжнем эканомікі рэгіёна. Якія праекты мадэрнізацыі і развіцця вытворчасцяў вызначылі дынаміку гэтых гадоў і паўплывалі на рост прамысловага патэнцыялу?***

— У прамысловасці вобласць дасягнула істотнага прыросту — за апошнія пяць гадоў аб'ём выпуску прамысловай прадукцыі павялічыўся больш як на 7 %. Гэты вынік стаў магчымым у тым ліку дзякуючы маштабным інвестыцыям — звыш 25 мільярдаў рублёў за пяць гадоў. Сродкі былі накіраваны на абнаўленне асноўных фондаў, павышэнне тэхналагічнага ўзроўню прадпрыемстваў, запуск новых вытворчасцяў, значных не толькі для вобласці, але і краіны ў цэлым.

Так, значнае месца займае Петрыкаўскі горна-абагачальны камбінат. Яго ўвод у эксплуатацыю дазволіў стварыць больш за тысячу працоўных месцаў, а здабыча хларыду калію дасягнула каля чатырох мільёнаў тон з моманту запуску.










42 тысячы доўгажыхароў ва ўзросце 90 гадоў і старэйшых, у тым ліку 586 доўгажыхароў ва ўзросце 100 гадоў і больш. Акцыя таксама закране адзінокіх пажылых грамадзян (каля 126 тысяч чалавек), адзінока пражываючых пажылых (амаль 808 тысяч чалавек), а таксама каля двух мільёнаў ветэранаў працы.

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны зацвердзіла план мерапрыемстваў правядзення сёлетняй акцыі. У яго ўключана больш за 20 разнастайных ініцыятыў. Цэнтральнымі элементамі стануць традыцыйныя адзіныя тэматычныя дні. Сярод асноўных мерапрыемстваў — урачыстыя акцыі ў абласцях і Мінску, якія пройдуць 23 снежня. Плануецца, што ў першы дзень у акцыі прымуць удзел каля 2,5 тысячы чалавек. Акрамя таго, 3 студзеня 2026 года Вялікі тэатр запрашае пажылых гасцей на навагодні святочны канцэрт, пераважна гэта будуць жыхары Мінска і Мінскай вобласці. А 9 студзеня адбудзецца тэматычны дзень баляў «Калядная сімфонія». Плануецца, што ўдзел у мерапрыемствах прымуць прыкладна 700 чалавек. Завершыць акцыю 14 студзеня адзіны тэматычны дзень «Добрыя справы на Новы год», у рамках якога валанцёры сярэбранага ўзросту разам з моладдзю павіншуюць са святамі пажылых грамадзян, у тым ліку тых, якія пражываюць ва ўстановах сацыяльнага абслугоўвання. Плануецца, што ў гэтым мерапрыемстве паўдзельнічае больш за 23 тысячы чалавек з ліку пажылых грамадзян і моладзі. Усяго ў адзіных тэматычных днях мяркуецца ўдзел больш за 27 тысяч чалавек.

«Ад усёй душы» — натуральны працяг традыцыйнай навагодняй дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці», адзначыла Галіна Лазарэнка. Пасыл заключаецца ў тым, што спачатку ўдзяляюць увагу пераважна маладому, падрастаючаму пакаленню, а потым моладзь прымае ініцыятыву клопату пра старэйшае пакаленне. Такім чынам, сімвалічна, што эстафета дабра перадаецца ад дзяцей да пажылых. «Мэта нашай акцыі даволі простая, але вельмі важная — выказаць глыбокую ўдзячнасць і павагу нашым бабулям і дзядулям, паказаць моладзі важнасць беражлівых адносін да старэйшага пакалення, адзначыць неабходнасць аказання дапамогі і падтрымкі, умацавання традыцый сямейнага дабрабыту. Задача акцыі — акружыць асаблівым клопатам усіх пажылых людзей», — падкрэсліла спецыяліст.

**Яна ВАЛАСАЧ.**
**Фота з архіва БелТА.**





Паралельна развіваліся і іншыя галіны. На Добрушскай фабрыцы «Герой працы» наладжана вытворчасць мелаванага і немелаванага кардону, асвоены выпуск трохслаёвага кардону. У Светлагорску арганізавана імпартазамяшчальная вытворчасць нітрылавых і латэксных пальчатак для медыцынскай і харчовай сфер, пашыраны магутнасці па выпуску поліпрапіленавых тканін і мяккіх сярэднетанажных кантэйнераў. Вялікае значэнне мае праект Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода. Тут уведзены комплекс гідракрэкінгу цяжкіх нафтавых рэштак, які дазволіў павысіць глыбіню перапрацоўкі нафты да 90 % і павялічыць выхад светлых нафтапрадуктаў да 74 %. У Гомелі створана вытворчасць прыбораў уліку энергарэсурсаў і аўтаматызаваных сістэм кіравання, збору і перадачы даных уліку энергарэсурсаў з прымяненнем выдаленай перадачы даных. Шэраг прадпрыемстваў харчовай прамысловасці — Тураўскі малочны камбінат, «Спартак», «БЕЛСЫР», Рагачоўскі МКК, кампанія «Сябры» — прайшлі глыбокае тэхнічнае пераўзбраенне, што вывела вытворчасці на новы ўзровень.

***— Асобную ўвагу прыцягваюць вынікі, дасягнутыя Гомельшчынай у сферы імпартазамяшчэння.***

— Падмуркам поспеху стала сістэмная работа прадпрыемстваў па лакалізацыі вытворчасці, павелічэнні глыбіні перапрацоўкі прадукцыі, забеспячэнні патрэб не толькі ўнутранага, але і знешняга рынку, а як вынік — паступленне валюты ў краіну за кошт экспартных паставак.

Калі ў 2020 годзе ў рэгіёне камунальныя і прыватныя прадпрыемствы выпускалі 94 найменні імпартазамяшчальнай прадукцыі на суму каля 600 мільёнаў долараў, то ў 2025 годзе — ужо 158 таварных пазіцый на суму звыш мільярда долараў. Рост забяспечаны асваеннем новых тэхналогій, паглыбленнем перапрацоўкі і самастойным выпускам кампанентаў, якія раней пастаўляліся з-за мяжы.

Характэрныя прыклады добра ілюструюць гэты рух. Прадпрыемства «Гомелькабель» наладзіла выпуск меднага эмаліраванага дроту для патрэб Мінпрама. Кампанія «Фрэшпак Салюшэнс» забяспечвае мяса-малочную галіну пакетамі і бар'ернымі плёнкамі. «Алкапак» выпускае ўшчыльнік для вінтавога алюмініевага каўпачка, які выкарыстоўваецца ў алкагольнай прамысловасці. Шклозавод «Ведатранзіт» вырабляе слоікі для кансервавання, запатрабаваныя вытворцамі плодаагароднінная прадукцыі. Усе гэтыя кірункі дазваляюць умацоўваць унутраны рынак і фарміраваць экспартную выручку.

***— Экспартныя паказчыкі Гомельскай вобласці традыцыйна істотныя. Што стала асновай экспартных паставак, у тым ліку значнага павелічэння таваразвароту з Кітаем?***

— Сапраўды, экспартная накіраванасць — адзін з моцных бакоў эканомікі нашага рэгіёна. Больш за палову ўсёй прадукцыі, якая выпускаецца на прадпрыемствах Гомельшчыны, ідзе на знешнія рынкі. За пяць гадоў сумарны аб'ём экспарту перавысіў 20 мільярдаў долараў. Гэта стала магчымым дзякуючы канкурэнтаздольнасці прадукцыі, інвестыцыям у мадэрнізацыю вытворчасцяў, дыверсіфікацыі рынкаў збыту.

Стратэгічна важным кірункам застаецца рынак Кітайскай Народнай Рэспублікі. Таваразварот Гомельскай вобласці з Кітаем вырас амаль у чатыры разы і перавысіў 370 мільёнаў долараў. Аснову экспарту складаюць цэлюлоза, лесаматэрыялы, мяса-малочная і кандытарская прадукцыя. Гэтыя пазіцыі ў цэлым дэманструюць устойлівы попыт і добрую рэпутацыю на міжнародных рынках. Рост экспарту сведчыць пра тое, што прадпрыемствы вобласці эфектыўна адаптуюцца да патрэб знешніх партнёраў і прапануюць прадукцыю, якая адпавядае сучасным патрабаванням.

***— Развіццё рэгіёна ацэньваецца не толькі па эканамічных паказчыках, але і па якасці жыцця яго жыхароў. Якія змены ў будаўніцтве, інфраструктуры і сацыяльнай сферы найбольш прыкметна паўплывалі на ўзровень камфорту і дабрабыту насельніцтва?***

— За пяць гадоў узведзена больш за 2,3 мільёна квадратных метраў жылля, у тым ліку каля 550 тысяч — у сельскай мясцовасці. Гэта дазволіла павялічыць забяспечанасць жыллём з 27,3 да 29,5 квадратнага метра на чалавека. Інфраструктурныя пераўтварэнні закранулі дзясяткі населеных пунктаў. Пабудавана 159 станцый абезжалезвання, якія забяспечылі доступ да якаснай пітной вады для 312 населеных пунктаў. Праведзены капітальны рамонт больш як 700 дамоў, заменена звыш 900 ліфтаў, рэканструявана 27 кацельняў і 11 маставых збудаванняў.

Асобная ўвага — сацыяльнай інфраструктуры. У Гомелі адкрыты новы дзіцячы садок і плавальны басейн. У Жлобіне і Светлагорску з'явіліся лядовыя арэны, фізкультурна-аздараўленчы цэнтр «Палессе-Арэна» ў Мазыры. Рэалізаваны шэраг праектаў у сферы аховы здароўя і сацыяльнага абслугоўвання. Усё гэта адчувальна ўплывае на паўсядзённае жыццё жыхароў вобласці. Вынікам стала і павелічэнне даходаў. Так, рэальная заработная плата з 2021 года да кастрычніка 2025-га ў рэгіёне павялічылася на 45 %. Такі вынік сведчыць, наколькі эканамічны рост мае прамое адлюстраванне ў жыцці людзей.

**Гутарыла Наталля КАПРЫЛЕНКА.**





# ГЕНАЦЫД НЕ МАЕ ТЭРМІНАЎ ДАЎНАСЦІ

## Аб гэтым яшчэ раз было заяўлена на міжнароднай канферэнцыі ў Мінску

Неабходная прапрацоўка прававога механізма прызнання факта генацыду савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны на міжнародным узроўні — адна з асноўных тэм, якія абмяркоўваліся ў Мінску на Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прымеркаванай да 77-годдзя з дня прыняцця Канвенцыі ААН аб папярэджанні генацыду і пакаранні за яго.



Было таксама ўзнята пытанне аб магчымасці прад'яўлення матэрыяльных прэтэнзій вінаватым краінам. Урадавая камісія Беларусі ўстанавіла, што ўрон, які быў нанесены фашысцкай Германіяй, іх памагатымі на акупіраванай тэрыторыі БССР, складае не менш як 2,3 трлн. долараў.

Удзельнікі канферэнцыі адзначалі, што пасля Вялікай Айчыннай вайны праведзена сур'ёзная работа, але многія палажэнні, якія былі прыняты ў пасляваенны перыяд, сёння не зусім адпавядаюць рэчаіснасці. Вельмі важныя бясспрэчныя прававыя механізмы прыцягнення да адказнасці за злачынствы, за факты генацыду ў гады Вялікай Айчыннай вайны ўсіх вінаватых: гэта не мае тэрмінаў даўнасці.

### НАС ХАЦЕЛІ ЗНІШЧЫЦЬ, І МЫ ПАВІННЫ ПРА ГЭТА ПАМЯТАЦЬ

Паводле слоў **Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ**, беларусы вынеслі важныя ўрокі з гісторыі і ўсвядомілі, што мір — найвялікшая каштоўнасць, якая патрабуе нашай пастаяннай увагі і рашучых дзеянняў па яе абароне. Як заўважыла спікер, шырокая прысутнасць на канферэнцыі кіраўнікоў дзяржаўных органаў, вучоных, гісторыкаў, экспертаў з розных краін свету пацвярджае, што ў грамадстве расце запыт на мір, на захаванне гістарычнай памяці, недапушчэнне любых форм агрэсіі і распальвання нянавісці.

«Наша краіна паслядоўна праводзіць міралюбівую палітыку і выступае за гуманізм і павагу да памяці ахвяр вайны», — адзначыла Наталля Качанава. Аднак, нягледзячы на ўрокі мінулага, працягнула яна, сёння мы зноў бачым спробы адраджэння фашызму і гераізацыі нацызму, якія ў некаторых краінах падтрымліваюцца на дзяржаўным узроўні.

«Таму мы, парламентарыі, разам з прадстаўнікамі іншых дзяржаўных органаў з'яўляемся праваднікамі і абаронцамі гістарычнай праўды», — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА** падчас выступлення на канферэнцыі нагадаў, што Канвенцыя ААН аб папярэджанні злачынства генацыду і пакаранні за яго стала вынікам усведамлення сусветнай супольнасцю жахаў Другой сусветнай вайны і гатоўнасці супрацоўнічаць у імя таго, каб яны не паўтарыліся: «Нашы гераічныя продкі, якія разграмілі фашызм, верылі, што заклалі трывалыя асновы мірнага развіцця для будучых пакаленняў. Аднак праз восем дзесяцігоддзяў чалавецтва зноў апынулася на мяжы катастрофы. І гэтаму садзейнічае безадказная рэваншысцкая палітыка заходніх краін. Еўропа актыўна мілітарызуецца, парушаючы ваенны баланс і імкліва набліжаючы глабальны канфлікт.

«Наш абавязак — нагадаць свету, да чаго прыводзяць такія амбіцыі, і замацаваць у свядомасці сучаснікаў справядлівую ацэнку крывавых злачынстваў нацыстаў і іх саўдзельнікаў, учыненых у гады Вялікай Айчыннай вайны», — адзначыў Ігар Сергяенка.

### КАРНІКАМІ БЫЛІ НЕ ТОЛЬКІ ЭСЭСАЎЦЫ

Паводле слоў **генеральнага пракурора Беларусі Андрэя ШВЕДА**, надышоў час вярнуцца да тых дакументаў, тых матэрыялаў, якія былі прыняты пасля Вялікай Айчыннай вайны, матэрыялаў Нюрнбергскага працэсу і яшчэ раз сказаць усяму свету аб тым, што недапушчальна праўдзенне генацыдных палітык, генацыдных аперацый — самых жорсткіх з'яў у гісторыі чалавецтва.

Андрэй Швед паведаміў: «У наступным годзе плануем не менш за сем, можа, дзесяць крымінальных спраў у дачыненні да канкрэтных ка́таў, якія не панеслі пакарання, у тым ліку якія потым жылі пасля вайны, памерлі на тэрыторыі ФРГ, іншых краін». Генпракурор дадаў, што гэты працэс будзе весціся пастаянна.

Згодна з беларускім заканадаўствам, якое было зменена па прапанове Генеральнай пракуратуры, у Вярхоўны Суд накіроўваюцца крымінальныя справы ў дачыненні да нацысцкіх злачынцаў, якія не панеслі заслужанага пакарання. Размова ідзе не толькі пра камандзіраў карных нацыяналістычных падраздзяленняў, але і пра камандзіраў падраздзяленняў вермахта.

«Гэта бясспрэчны факт. Большасць карных падраздзяленняў — ваеннаслужачыя Узброеных сіл Германіі», — адзначыў генпракурор.

**Сяргей КАНДРАЦЬЕЎ, намеснік старшыні Вярхоўнага Суда** (менавіта ў самай высокай судовай інстанцыі разглядаюцца справы аб генацыдзе) адзначыў: «Дакладна ўстаноўлена, што зверствы на тэрыторыі Беларусі здзяйсняліся не толькі нацысцкімі акупантамі, але і іх памагатымі з ліку выхадцаў з Заходняй Украіны і краін Прыбалтыкі. Матэрыялы крымінальных спраў і тыя нешматлікія сведкі расказваюць пра такія факты, якія раней проста не даводзіліся да шырокай грамадскасці».

«І наша галоўная задача пры разглядзе крымінальных спраў не толькі выявіць або паказаць тое, што сапраўды адбывалася ў гады вайны, не толькі паказаць і пайменна назваць датычных да шматлікіх рэпрэсій, але і паказаць будучым пакаленням, нашым дзецям і ўнукам, якой цаной дасталася перамога, якую цану заплаціў беларускі народ», — упэўнены намеснік старшыні ВС Беларусі.

### ЗАХАВАННЕ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ — СТРАТЭГІЧНАЯ ЗАДАЧА

Як лічыць **міністр абароны Віктар ХРЭНІН**, сёння, калі ўвесь свет праходзіць праз варонку сістэмнага геапалітычнага крызісу і глабальнай напружанасці, як ніколі важна аб'яднанне намаганняў усіх прагрэсіўных сіл чалавецтва па процідзеянні распаўсюджванню самых антыгуманных практык і рэваншысцкіх памкненняў еўрапейскай «партыі вайны». «Бо толькі разам, як гэта не аднойчы ўжо было ў сусветнай гісторыі, мы можам прадухіліць новую сусветную катастрофу», — сказаў ён.

**Дзяржсакратар Савета Бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ** упэўнены, што аб учыненых злачынствах, якія кваліфікуюцца цяпер як генацыд, неабходна не толькі памятаць, але і гаварыць, рашуча спыняць спробы скажэння гістарычных падзей. «Юрыдычная ацэнка дзеянняў нацысцкіх злачынцаў на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў якасці генацыду з'яўляецца не проста правам, а абавязкам нашай краіны па захаванні гістарычнай памяці і абароне суверэнітэту. Для беларусаў, якія страцілі ў вайне кожнага трэцяга жыхара, захаванне гісторыі з'яўляецца стратэгічнай задачай», — дадаў ён.

У абноўленай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Беларусі абарона гістарычнай памяці прынята ў якасці стратэгічнага нацыянальнага інтарэсу. «Скажэнне гістарычнай праўды і памяці аднесена да асноўных пагроз нацыянальнай бяспецы. Палажэнне аб недапушчальнасці фальсіфікацыі гісторыі замацавана і ў Асноўным законе Беларусі, што стала важным крокам для фарміравання нацыянальнай самасвядомасці на аснове пераемнасці пакаленняў», — падкрэсліў дзяржсакратар Савета Бяспекі.

**Анатоль СЛАНЕЎСКІ.**


## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Профитсистем»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. (3 %) | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1783 | Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-610835, площадь – 217,9 кв. м, назначение – Квартира, наименование – Квартира. В состав объекта входит: Котел газовый VAILLIANT VK INT 35/K-1E, Газовый проточный водонагреватель Ariston Superlux DGI 10LCF, Кондиционер LG S09LHP, Кондиционер Tadilux TRM 12, Кондиционер Tadilux TRM 12, козырек.<br>Кондиционер Toshiba (инв. 20084-1); Кондиционер KB 2-2.20 Энергия (инв. 20083); Кондиционер DAIKIN (внутренний FTXF35C +наружный RXF35C-блоки сплит-системы) (инв. 70041017); Кондиционер LG (инв. 00005427); Система контроля доступа (инв. 70280); Слаботочная линии связи в адм. пом. ГО (инв. 48013002); Система вентиляционная (инв. 41602018); Система пожарной сигнализации (инв. 50426205); Ограждение с полимерным покрытием; Счетчик холодной воды ETK-м-N с электронным модулем сбора данных PDC LR – (инв. 47063001) | 500 189,36 | 15 005,68 | 25 009,47 |

В отношении лота № 1783 проводятся десятые повторные торги.
**Стоимость снижена на 55 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» от 01.11.2025

**Местонахождение лота № 1783:** г. Минск, ул. Достоевского, 27-1

Помещение с инв. № 500/D-610835 (лот № 1783) и земельный участок под ним имеет обременение в виде залога ОАО «Приорбанк». В случае продажи объекта на торгах залог прекращается в силу законодательства (ст. 15 Закона Республики Беларусь от 20.06.2008 № 345-З (ред. от 28.06.2022) «Об ипотеке»). Объект используется не по назначению на основании решения администрации Советского района г. Минска № 1058 от 22.10.2013 «О согласовании использования не по назначению квартиры в жилом доме»

Лот № 1783 расположен на земельном участке с кадастровым номером 500000000008000483, площадь 0,0360 га, назначение – Строительство и обслуживание жилого дома. Право собственности (залог права ОАО «Приорбанк»)

Изолированное помещение с инв. № 500/D-610835 (лот № 1783) является частью блокированного двухэтажного здания, имеет отдельный подъезд, собственный земельный участок площадью 0,036 га. **Помещение пригодно к административному использованию, для этого соблюдены все технические требования. Необходимые для обслуживания помещения инженерные коммуникации подведены и исправны.** Имеется центральная канализация. Согласно актуальному генплану здание под снос не подпадает

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **24 декабря 2025 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | с 10.00 12 декабря 2025 года до 16.00 22 декабря 2025 года |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту __, ООО «Профитсистем», проводимых 24.12.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты на размещение публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 2,5 % от конечной цены предмета торгов.** Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов осуществляется согласно договору купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – Сергей, тел. +375293718060.
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Организатор торгов вправе отказаться от проведения аукциона, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.
10. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ООО «Профитсистем», в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375173958917 (220040, г. Минск, ул. Достоевского, 27)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

# АКЦЭНТ — НА РАЗВІЦЦЁ

## Урадам Беларусі зацверджаны пералікі дзяржаўных і рэгіянальных навукова-тэхнічных праграм на 2026—2030 гады

Адпаведную пастанову падпісаў Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын, паведамілі ў прэс-службе ўрада.

Тут растлумачылі, што пералікі сфарміраваны ў адпаведнасці з прыярытэтнымі напрамкамі навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці на 2026 — 2030 гады. Работа па іх падрыхтоўцы грунтавалася на даручэнні кіраўніка дзяржавы аб павышэнні практыка-арыентаванасці навукі.

У прыватнасці, у пералікі ўключаны 20 дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм і 6 рэгіянальных.

Для забеспячэння эфектыўнай камерцыялізацыі вынікаў навукова-даследчых і вопытна-канструктарскіх (і вопытна-тэхналагічных) работ праграмы сфарміраваны з максімальным прыцягненнем галіновых рэгулятараў у якасці заказчыкаў (17 з 20 дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм будуць выконвацца пад галіновы заказ).

Па кожнай праграме вызначаны аб'ёмы фінансавання (у тым ліку з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў), а таксама дзяржаўныя заказчыкі і галаўныя арганізацыі-выканаўцы.

Ва ўрадзе адзначылі, што паспяховая рэалізацыя дзяржаўных і рэгіянальных навукова-тэхнічных праграм акажа непасрэдны ўплыў на павышэнне тэхналагічнага ўзроўню і канкурэнтаздольнасці айчыннай прадукцыі (у тым ліку ў галіне машынабудавання, робататэхнікі, медыцыны, біятэхналогій і інш). Таксама павялічыць інавацыйную актыўнасць галін і рэгіёнаў, забяспечыць распрацоўку і ўкараненне ў рэальным сектары эканомікі, ваенна-тэхналагічнай і іншых сферах перадавых айчынных тэхналогій. А яшчэ, апроч іншага, створыць новыя вытворчасці навукаёмістай і высокатэхналагічнай прадукцыі.



# СТАЎКА РАСЦЕ

## З 1 студзеня 2026 года памер базавай стаўкі для аплаты працы ў бюджэтнай сферы складзе 297 рублёў



Адпаведную пастанову падпісаў Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын, паведамілі ў прэс-службе ўрада.

Трэба сказаць, што павышэнне базавай стаўкі прадугледжваецца на 8,8 % (з 273 да 297 рублёў).

# ЭФЕКТЫЎНЫЯ ПАДЫХОДЫ

Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын падпісаў пастанову Савета Міністраў, якой абноўлены склад Савета па развіцці прадпрымальніцтва



Паводле дакумента, старшынёй Савета з'яўляецца Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь, членамі Савета — 26 паспяховых кіраўнікоў прыватнага вытворчага бізнесу розных галіновай накіраванасці і рэгіянальнага прадстаўніцтва. Іх арганізацыі стварэліся з нуля і прайшлі шлях ад ідэі да прадпрыемства, якое эфектыўна функцыянуе. Некаторыя з'яўляюцца пераможцамі Нацыянальнага конкурсу «Прадпрымальнік года» ў намінацыі «Эфектыўны бізнес».

Як падкрэслілі ва ўрадзе, практычны вопыт кіравання прадпрыемствамі дазволіць членам Савета своечасова выяўляць актуальныя праблемы прадпрымальніцкай супольнасці, ацэньваць іх наступствы і прапаноўваць магчымыя варыянты рашэння.

# ВАЖКАЯ ПАДТРЫМКА

## Сямейны капітал для шматдзетных сем'яў на 1 снежня



Як паведамілі ў Мінпрацы і сацабароны, для шматдзетных сем'яў адкрыта 150 598 дэпазітных рахункаў «Сямейны капітал», сярод якіх 82,6 тысячы дэпазітных рахункаў на суму 826 мільёнаў долараў ЗША і 67,9 тысячы дэпазітных рахункаў на суму 1,81 мільярда рублёў.

На датэрміновае распараджэнне сродкамі сямейнага капіталу пададзена 100 987 заяў. З іх на мэты паляпшэння жыллёвых умоў — 80 990, на атрыманне медыцынскіх паслуг — 10 986, на атрыманне адукацыі — 9 004, на набыццё тавараў для інвалідаў — 7.

Нагадаем, што сямейны капітал прызначаецца шматдзетным сем'ям пры нараджэнні (усынаўленні, удачарэнні) трэцяга або наступнага дзіцяці.

# ПРАЗРЫСТАСЦЬ І НАДЗЕЙНАСЦЬ

## Укараненне навігацыйных пломбаў у ЕАЭС: да старту ўжо менш за тры месяцы

11 лютага пачынаецца першы этап абавязковага прымянення навігацыйных пломбаў на тэрыторыі краін Еўразійскага эканамічнага саюза, паведамілі ў прэс-службе Еўразійскай эканамічнай камісіі.

Гэтая ініцыятыва закране прадукцыю алкагольнай і тытунёвай прамысловасці, а таксама тавары масавага спажывання, якія перавозяцца аўтамабільным і чыгуначным транспартам.

Праект распрацоўваўся шэсць гадоў і прайшоў доўгі шлях ад ідэі да рэалізацыі. Пагадненне было падпісана ў 2022 годзе. Сёння краіны ЕАЭС знаходзяцца на фінальнай стадыі.

У рамках падрыхтоўкі да запуску сістэмы абавязковых навігацыйных пломбаў у ЕЭК праведзены цыкл канферэнцый. На апошняй з іх асаблівая ўвага была ўдзелена аператарам Беларусі і Казахстана, якія прадставілі сваю працу. Беларускі бок паказаў стабільную эксплуатацыю пломбаў, пацвердзіўшы паспяховасць тэсціравання. Казахстанскі бок, у сваю чаргу, паведаміў аб завяршэнні пілотнага этапу і пераходзе да паўнавартаснай прамысловай эксплуатацыі.





ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «Гараторг групп», УНП 691 734 271, 222161, г. Жодино, пр-т Мира, д. 19а, пом. 21 |

| № п/п | Наименование предмета электронных торгов | Общая площадь, кв. м | Начальная цена (с НДС 20 %), долл. США* |
|---|---|---|---|
| 1 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18830 | 5,3 | **20 487,60** |
| | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18831 | 48,9 | |
| 2 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18836 | 15,2 | **6 320,16** |
| 3 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18837 | 15,2 | **6 320,16** |
| 4 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18841 | 49,6 | **17 677,44** |
| 5 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18847 | 18,2 | **38 911,75** |
| | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18848 | 14,8 | |
| | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18849 | 14,9 | |
| | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18850 | 17,0 | |
| | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18851 | 14,7 | |
| 6 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18853 | 12,7 | **4 526,28** |
| 7 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18854 | 22,6 | **13 863,96** |
| | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18855 | 16,3 | |
| 8 | Торговое помещение, инв. номер 612/D-18856 | 21,4 | **7 626,96** |

**Местоположение: Минская область, г. Жодино, пр-т Мира, д. 19а**

**Оплата предмета электронных торгов производится в белорусских рублях в сумме, эквивалентной цене продажи лота в долл. США по курсу НБРБ на дату проведения платежа*

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату внесения платежа на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи (если не достигнута иная договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона)

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от **4 %** до **6 %** от цены продажи в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

